**УДК 39(476):930.1(476)"19"+902/904(476)(092)Сядоў DOI 10.52928/2070-1608-2026-79-3-22-26**

# СТАНАЎЛЕННЕ КАНЦЭПЦЫІ БАЛЦКАГА СУБСТРАТУ Ў ЭТНАГЕНЕЗЕ БЕЛАРУСАЎ У ПРАЦАХ В.В. СЯДОВА (1950 – 1970-я гг.)

***канд. гіст. навук С.С. ЮРЭЦКІ***
***(Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі, Мінск)***
***e-mail: st.yuretski@yandex.by***

*Артыкул з’яўляецца гістарыяграфічным даследаваннем. Публікацыя прысвечана выяўленню сутнасці і этапаў у станаўленні канцэпцыі балцкага субстрату ў этнагенезе беларусаў у працах археолага В.В. Сядова ў 1950 – 1970-я гг. Разгледжаны прычыны, якія абумовілі актуалізацыю балцкай праблематыкі ў кантэксце вывучэння этнагенезу ўсходніх славян у савецкай археалогіі. Вызначаны этапы ў станаўленні дадзенай канцэпцыі.*

***Ключавыя словы:*** *гістарыяграфія, гісторыя археалагічнай навукі, этнагенез, славяне, беларусы, балты, балцкі субстрат.*

**Уводзіны.** У айчыннай гістарыяграфіі адной з самых актуальных і складаных праблем з’яўляецца этнагенез беларусаў. Дадзенае пытанне шчыльна звязанае з вывучэннем вытокаў беларускай дзяржаўнасці. Сучасны стан ведаў наконт этнагенезу беларусаў і пачаткаў нашай дзяржаўнасці ў абагуленым выглядзе адлюстраваны ў першым томе акадэмічнай калектыўнай манаграфіі «История белорусской государственности» пад рэдакцыяй акадэміка А.А. Кавалені [1, с. 59–229], а таксама ва ўніверсітэцкім выданні «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» пад рэдакцыяй члена-карэспандэнта І.А. Марзалюка [2, с. 22–50, 331–354]. Пры гэтым праблематыка этнагенезу беларусаў з’яўляецца шматаспектнай і застаецца актуальнай для далейшага ўсебаковага вывучэння. Найважнейшым фактарам такіх даследаванняў павінны стаць гістарыяграфічныя працы па дадзенай тэме.

У гістарыяграфіі вядома некалькі асноўных канцэпцый паходжання беларускага этнасу: племянная, славянскага аўтахтанізму, старажытнаруская і субстратная балцкая [2, с. 331–335]. Сярод іх адметнае месца займае канцэпцыя балцкага субстрату ў паходжанні беларусаў. Актуальнасць далейшага і больш паглыбленага вывучэння балцкага фактару ў этнічнай гісторыі беларусаў падкрэсліў у сучасным выданні член-карэспандэнт І.А. Марзалюк [2, с. 338–339]. Асобныя фрагменты дадзенай буйной тэмы прадстаўлены ў калектыўных выданнях, гістарыяграфічных раздзелах манаграфій, артыкулах, у тым ліку ў энцыклапедычных і біябібліяграфічных выданнях [1, с. 25–37; 2, с. 331–339; 3, с. 5–9; 4, с. 402–404; 5, с. 12, 14–15; 6; 7; 8, с. 192–195; 9, с. 20, 29; 10; 11, с. 11–30]. Аднак апублікаваныя працы не даюць поўнага ўяўлення аб усім аб’ёме назапашанай айчыннымі археолагамі інфармацыі наконт удзелу балтаў у паходжанні беларусаў.

Дзякуючы навуковай дзейнасці савецкага і расійскага археолага В.В. Сядова ў перыяд 1950–1970-х гг. была створана канцэпцыя балцкага субстрату ў этнагенезе беларусаў [12, с. 12–16; 13, с. 304–306; 14, с. 32–38; 15, с. 185–186], якая выклікала значную дыскусію ў савецкай гістарыяграфіі. Мэтай нашага артыкула з’яўляецца выяўленне сутнасці і этапаў у станаўленні канцэпцыі балцкага субстрату ў этнагенезе беларусаў у працах В.В. Сядова ў 1950 – 1970-я гг. Пры гэтым неабходным з’яўляецца вырашэнне шэрагу задач. Варта разгледзець прычыны, якія абумовілі зварот савецкіх археолагаў да балцкай праблематыкі ў кантэксце даследавання паходжання ўсходніх славян, у тым ліку і беларусаў. Патрэбна таксама выявіць этапы ў станаўленні канцэпцыі балцкага субстрату ў этнагенезе беларусаў у агульным кантэксце развіцця савецкай археалогіі таго часу.

Асновай для даследавання стала кола гістарыяграфічных крыніц. У яго ўвайшлі ў першую чаргу апублікаваныя навуковыя працы савецкіх археолагаў пазначана перыяду, у якіх разглядаецца балцкі фактар у этнагенезе ўсходніх славян, перадусім беларусаў. Карыснымі для вывучэння таксама сталі аўтарэфераты і дысертацыі даследчыкаў па названай праблеме.

Артыкул падрыхтаваны, зыходзячы з метадалагічных прынцыпаў аб’ектыўнасці, гістарызму і сістэмнасці, уласцівых дыялектычнаму матэрыялізму. Выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя метады (аналіз і сінтэз, дэдукцыя і індукцыя, параўнанне і абагульненне), так і канкрэтна-гістарычныя (гісторыка-параўнальны і гісторыка-генетычны).

**Перадумовы і пачатак станаўлення канцэпцыі.** Аналіз навуковай спадчыны В.В. Сядова дазваляе прасачыць эвалюцыю канцэпцыі балцкага субстрату ў этнічнай гісторыі беларусаў ад яе зараджэння ў 1950-я гг. і да фінальнага афармлення да пачатку 1970-х гг. Коратка разгледзім стан балцкай праблемы ў савецкай археалогіі напярэдадні з’яўлення прац В.В. Сядова.

Увага на наяўнасць на беларускіх землях археалагічных старажытнасцей, якія суадносяцца са старажытнымі балтамі, была звернута даследчыкамі яшчэ напрыканцы XIX ст. [16; 17]. У міжваенны час А.А. Спіцын выказаўся аб наяўнасці балцкага перыяду ў старажытнай гісторыі Беларусі, пачынаючы з эпохі неаліту [18, с. 25–28]. Беларускія археолагі, перадусім А.М. Ляўданскі, таксама атаясамлялі мясцовыя помнікі жалезнага веку з балцкім насельніцтвам [19, с. 184–185; 20, с. 336; 21, с. 59–60]. А.М. Ляўданскі адзначаў уплыў балтаў на культуру славян па матэрыялах вывучэння курганоў [20, с. 337–338] Адзначым, што ў сваім даследаванні старажытнасцей летапісных радзімічаў Б.А. Рыбакоў вылучыў асобныя балцкія элементы сярод славянскіх матэрыялаў [22, с. 137–138].

Пры гэтым згаданае атаясамленне помнікаў жалезнага веку са старажытнымі балтамі мела папярэдні характар. Пра гэта сведчыць і ўзровень распрацаванасці праблемы ў буйных этнагенетычных працах савецкага археолага П.М. Траццякова 1940-х – пачатку 1950-х гг., у якіх гарадзішчы са штрыхаванай керамікай гіпатэтычна звязваліся з балцкім насельніцтвам [23, с. 49; 24, с. 91–92].

Паказальнымі з'яўляюцца даследаванні беларускага археолага В.Р. Тарасенкі, які апрабаваў свае вынікі ў якасці кандыдацкай дысертацыі (Інстытут гісторыі матэрыяльнай культуры імя М.Я. Мара АН СССР, 1947 г.[1]). Праца на тэму «К истории верхнего Поднепровья и Белоруссии в I тысячелетии нашей эры (по археологическим данным)» з'явілася не толькі першай абароненай дысертацыяй, але і першым этнагенетычным даследаваннем у айчыннай археалогіі. В.Р. Тарасенка ўслед за аўтахтоннай тэорыяй М.Я. Мара, якая на той момант была пануючай у савецкай археалогіі, лічыў славян аўтахтонным насельніцтвам на тэрыторыі Беларусі, пачынаючы з эпохі неаліту. Наяўнасць на мяцовых помніках штрыхаванай керамікі звязвалася з балтамі і адносілася навукоўцам да часоў балта-славянскага адзінства [25, с. 170–171]. У пачатку 1950-х гг. пасля знакамітай дыскусіі па пытаннях мовазнаўства адбылося крытычнае асэнсаванне творчай спадчыны М.Я Мара, пасля чаго яго тэарэтычныя распрацоўкі фактычна перасталі выкарыстоўвацца. Таму згаданыя палажэнні В.Р. Тарасенкі страцілі сваю актуальнасць, не былі шырока апублікаваныя і не зрабілі вялікага ўплыву на далейшае развіццё гістарыяграфіі.

Прыход у навуку В.В. Сядова ў пачатку 1950-х гг. супаў з карэнным пераглядам метадалогіі этнагенетычных даследаванняў у савецкай археалогіі пасля ўжо пазначанай крытыкі тэорыі М.Я. Мара. Найважнейшым вынікам перамен стаў заклік навукоўцаў да вывучэння праблем крыніцазнаўства і гістарыяграфіі, неабходнасці даследавання канкрэтных археалагічных культур і этнічных супольнасцей у старажытнасці, адмаўленне ад пазіцый гіпертрафіраванага аўтахтанізму [26, с. 5–8; 27, с. 6; 28, с. 20]. Такім чынам, у пачатку 1950-х гг. склаліся ўмовы для правядзення даследаванняў этнагенезу ўсходніх славян на якасна новым узроўні.

Неабходнасць далейшага вывучэння археалогіі ўсходніх славян была прадыктавана таксама патрэбай у больш паглыбленым вывучэнні кантактаў старажытных славян з суседнім неславянскім насельніцтвам. Дагэтуль у публікацыях разглядаліся пераважна пытанні наяўнасці сярод балцкіх старажытнасцей элементаў культуры славян. Так, маскоўскі археолаг А.У. Успенская ў сваёй кандыдацкай дысертацыі на тэму «Белорусское Полесье в X–XIII вв. (к истории древнерусской деревни)» (Інстытут гісторыі матэрыяльнай культуры АН СССР, 1953 г.) паказвала на наяўнасць славянскай керамікі і ўпрыгожванняў у пахаваннях аўкштайтаў Усходняй Літвы. Балцкія ж элементы ў славянскіх помніках (упрыгожванні), на думку даследчыцы, сведчылі *"о далеких связях местного населения с неславянскими странами"* [29, с. 13–14].

Менавіта ва ўмовах творчага перагляду падыходаў да вывучэння этнагенезу славян прыступіў да сваёй навукова-даследчай дзейнасці В. В. Сядоў. З пачатку 1950-х гг. ён распрацоўваў праблематыку этнічнага складу насельніцтва Наўгародскай, Пскоўскай і Смаленскай зямель старажытнарускага часу [11, с. 14–15]. Аснова этнагенетычных распрацовак В.В. Сядова была закладзена ў яго кандыдацкай дысертацыі на тэму: «Кривичи и словене» (Інстытут гісторыі матэрыяльнай культуры АН СССР, 1954 г.). У праблемнае поле даследавання ўвайшлі старажытнасці I тыс. н. э. і першых стагоддзяў II тыс. н.э. Навізна падыходу В.В. Сядова заключалася ў тым, што раней матэрыялы I і II тыс. разглядаліся абасоблена ад вывучэння старажытнарускіх плямёнаў [11, с. 4]. У дачыненні да тэрыторыі Беларусі ключавым палажэннем дысертацыі стаў доказ таго, што даславянскае насельніцтва з прыходам славян не пакінула сваіх паселішчаў. В.В. Сядовым паказваўся працэс славянскай каланізацыі і славянізацыі мясцовых балтаў. Сведчанні гэтаму былі знойдзены археолагам у матэрыялах курганоў XI–XIII стст., якія ўтрымлівалі знаходкі антрапалагічнага тыпу, характэрнага для балтаў [12, с. 14–15]. Яшчэ адным доказам балцкага характару даславянскага насельніцтва Верхняга Падняпроўя стала наяўнасць балцкай гідраніміі ў рэгіёне [30, с. 14, 18]. На той момант даследчыя палажэнні В.В. Сядова былі адметныя сваёй навізной. Беларускі археолаг А.Р. Мітрафанаў у кандыдацкай дысертацыі «К истории населения Средней Белоруссии в эпоху железа» (Ленінградскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Жданава, 1955 г.) не толькі падтрымаў В.В. Сядова, але творча развіў яго палажэнні і абгрунтаваў балцкую этнічную прыналежнасць культуры штрыхаванай керамікі [31, с. 189–190].

У падрымку В.В. Сядова выступіў і Л.В. Аляксееў, які займаўся вывучэннем старажытнасцей Полацкай зямлі. У абароненай ім кандыдацкай дысертацыі на тэму «Полоцкая земля в IX–XIII в.в.» (Інстытут гісторыі матэрыяльнай культуры АН СССР, 1955 г.) была разгледжана этнакультурная сітуацыя на тэрыторыі Сярэдняй і Паўночнай Беларусі ў I тыс. н. э. Паводле даследчыка, славянскія плямёны праніклі ў пазначаны рэгіён у сярэдзіне і другой палове I тыс. н. э. Асіміляцыя мясцовых балтаў адбылася, адпаведна Л.В. Аляксееву, да пачатку з'яўлення тут першага дзяржаўнага ўтварэння (Полацкага княства), стваральнікамі якога былі летапісныя палачане, аднесеныя археолагам да заходняй групы крывічоў [32, с. 6–8; 33, с. 60].

Важнае значэння для далейшага станаўлення канцэпцыі балцкага субстрату мелі даследаванні, якія ў 1950-я гг. апублікаваў эстонскі савецкі археолаг Х.А. Моара [15, с. 6; 34].

У выніку неабходна канстатаваць, што першы этап афармлення канцэпцыі балцкага субстрату адметны падрыхтоўкай і абаронай В.В. Сядовым кандыдацкай дысертацыі (першая палова 1950-х гг.). Галоўнай адметнасцю дадзенага этапу стала апрабацыя палажэння аб тым, што пры засяленні славянамі новых тэрыторый мясцовае даславянскае насельніцтва не пакінула месцаў свайго пражывання і было паступова славянізавана. Пры гэтым былі атрыманы даныя, якія сведчылі і пра ўплыў аўтахтонаў на находнікаў.

---

[1] Тут і далей у тэксце ў дужках будзе пазначацца тагачасная назва ўстановы, у якой адбылася абарона дысертацыі, а таксама год самой абароны.

**Канцэпцыя балцкага субстрату і яе сутнасць.** У далейшых даследаваннях В.В. Сядоў сканцэнтраваў сваю ўвагу на разглядзе адметнасцей усходнеславянскіх плямёнаў на тэрыторыі Беларусі і характары іх узаемадзеяння з мясцовым даславянскім балцкім насельніцтвам. Заўважым, што даследчык паставіў праблему не толькі ўплыву славянскай культуры на балтаў, але і ўздзеяння балцкага асяроддзя на прышлых славян. Новым словам у гістарыяграфіі стала яго абгрунтаванне ўкладу старажытнага балцкага насельніцтва ў этнічную гісторыю ўсходнеславянскіх летапісных плямёнаў на падставе даных археалогіі [35, с. 60, 62; 36, с. 107–108, 112, 121; 37, с. 118]. У выніку В.В. Сядоў прыйшоў да высновы, што найважнейшым чыннікам у фарміраванні беларускага этнасу стаў балцкі этнічны і моўны субстрат як галоўны фактар працэсу славянізацыі балтаў на тэрыторыі Беларусі ў VII–XII стст. Пры гэтым, адпаведна археолагу, беларуская народнасць, вядомая з XIV ст., сфарміравалася на падмурку адзінай старажытнарускай народнасці X–XIII стст. Для В.В. Сядова не падлягала сумневу адзінства паходжання рускага, украінскага і беларускага народаў [14, с. 35].

Спынімся на самой субстратнай тэорыі паходжання ўсходнеславянскіх народаў. Адпаведна ёй рускія, украінцы і беларусы сфарміраваліся на розных мясцовых этнічных субстратах, што і вызначыла іх адметнасці. В.В. Сядоў падкрэсліваў, што асаблівасцю беларусаў з’яўляецца наяўнасць у іх этнічнай гісторыі толькі аднаго субстрату – балцкага. Дадзены тэзіс абгрунтоўваўся наяўнасцю толькі балцкіх археалагічных культур, якія, адпаведна археолагу, знаходзіліся на будучай беларускай этнічнай тэрыторыі да з’яўлення там славян [38, с. 106, 119]. Сам тэрмін *“субстрат”* быў выкарыстаны адпаведна распрацоўкам Б.А. Сярэбраннікава ў галіне мовазнаўства, дзе ён разумеўся ў якасці мовы, якая была пераможана іншай мовай у выніку ўзаемадзеяння ў межах пэўнай тэрыторыі [39, с. 10, 21–22, 24]. У канцэпцыі этнагенезу беларусаў В.В. Сядовым пад этнічным субстратам разумелася *“та этническая группа, которая в результате просачивания на её территорию другого народа подверглась ассимиляции”* [37, с. 108]. У выніку археолаг сцвярджаў, што *“участие балтского субстрата в этногенезе славян Белоруссии есть не что иное как ассимиляция местных балтов славянами”* [37, с. 118].

Фінальнае афармленне канцэпцыі балцкага субстрату ў этнагенезе беларусаў адбылося ў абароненай В.В. Сядовым доктарскай дысертацыі «Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья (до XIV в.)» (Інстытут археалогіі АН СССР, 1966 г.), а таксама ў апублікаванай у 1970 г. манаграфіі [14, с. 30–38; 15, с. 162–186]. Сутнасць новай канцэпцыі была выпрацавана даследчыкам на падставе аналізу археалагічных крыніц і карэляцыі атрыманых вынікаў з данымі гідраніміі, мовазнаўства і этнаграфіі. Падкрэслім, што ўпершыню ў савецкай гістарыяграфіі аб’ектам даследавання стаў этнагенез беларусаў на падставе вывучэння ў першую чаргу археалагічных крыніц [14, с. 3]. Навуковец крытычна перагледзеў існуючыя раней падыходы да вырашэння праблемы паходжання беларускай народнасці. Навізна даследавання В.В. Сядова заключалася ў комплексным выкарыстанні сведчанняў балцкай прыналежнасці археалагічных матэрыялаў, даных антрапалогіі і балцкай гідраніміі на тэрыторыі фарміравання беларускага этнасу, а таксама наяўнасці этнаграфічных фактаў балцкага ўздзеяння на культуру беларусаў [14, с. 30–34]. Безумоўнай заслугай В.В. Сядова стала вызначэнне археалагічных сведчанняў укладу балцкага субстрату ў культуру ўсходніх славян, зробленае, перадусім, па матэрыялах з беларускай этнічнай тэрыторыі. Галоўнымі паказчыкамі сталі балцкія элементы матэрыяльнай культуры ў курганных пахаваннях летапісных усходнеславянскіх плямёнаў (крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў). Такія даныя былі атрыманы падчас вывучэння пахаванняў сельскага насельніцтва, абраднасць якога традыцыйна разглядаецца ў археалогіі ў якасці ключавога этнічнага паказчыка. У выніку пазначаныя факты былі інтэрпрэтаваны даследчыкам у якасці сведчанняў працэсу асіміляцыі прышлымі славянамі мясцовых балтаў, а таксама індыкатарам балцкага ўплыву на находнікаў [15, с. 162–171].

Атрыманыя В.В. Сядовым вынікі дазволілі перагледзець найважнейшую праблему этнагенезу беларусаў – комплекс прычын, якія прывялі да адасаблення і фарміравання беларускай народнасці на старажытнарускай аснове. Да прац В.В. Сядова пануючым поглядам на гэтую праблему была канцэпцыя Я.Ф. Карскага, адпаведна якой фарміраванне беларускай народнасці было выклікана ўключэннем часткі старажытнарускіх зямель у склад Вялікага Княства Літоўскага ў XIII–XIV стст. [40, с. 63–118]. Погляды Я.Ф. Карскага былі дапоўнены ў 1940-я гг. У.І. Пічэтай, які засяродзіў увагу на сацыяльна-эканамічных фактарах інтэграцыі беларускіх зямель у складзе Вялікага Княства Літоўскага ў XIII–XV стст. [41, с. 28–29]. Уцэлым згаданыя погляды падзяляў і М.Я. Грынблат, які выказваўся аб трываласці традыцый летапісных старажытнарускіх плямёнаў [42, с. 9–10]. У адказ на пануючыя погляды ў канцэпцыі В.В. Сядова балцкі субстрат вылучаўся ў якасці першапрычыны адасаблення часткі старажытнарускай народнасці на будучай беларускай этнічнай тэрыторыі і пачатку фарміравання беларускай народнасці ў XIII–XIV стст. Пры гэтым навуковец не адмаўляў важнасць уплыву ўваходжання беларускіх зямель у склад Вялікага Княства Літоўскага, але надаваў гэтым падзеям другасную ролю ў этнагенэзе беларусаў [15, с. 186].

Адзначым, што на карысць канцэпцыі балцкага субстрату сведчыла і праведзенае савецкім антраполагам В.П. Аляксеевым даследаванне, апублікаванае ў манаграфіі «Происхождение народов Восточной Европы (краниологическое исследование)» [43, с. 198–204].

Такім чынам, другі этап станаўлення канцэпцыі балцкага субстрату ў этнагенезе беларусаў адметны падрыхтоўкай і абаронай В.В. Сядовым доктарскай дысертацыі з апрабацыяй яе вынікаў (другая палова 1950-х – пачатак 1970-х гг.). У межах дадзенага даследавання ўпершыню ў савецкай гістарыяграфіі была пастаўлена праблема вывучэння паходжання беларускай народнасці на падставе даных археалогіі.

У сваіх больш позніх манаграфіях «Длинные курганы кривичей» (1974) і «Происхождение и ранняя история славян» (1979) В.В. Сядоў выкарыстоўваў сваю субстратную канцэпцыю [44, с. 40; 45, с. 34].

**Заключэнне.** У пачатку 1950-х гг. у савецкай археалогіі склаліся якасна новыя ўмовы для правядзення даследаванняў па этнагенезе ўсходніх славян. Дадзеныя ўмовы адметныя адыходам ад пазіцый гіпертрафіраванага аўтахтанізму, адпаведна якім усходнія славяне разглядаліся ў якасці аўтахтоннага насельніцтва на шырокай тэрыторыі Усходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі. Сталі заахвочвацца працы па вывучэнні праблем крыніцазнаўства і гістарыяграфіі ў археалогіі. Менавіта ў такіх умовах распачаў свае навуковыя даследаванні савецкі і расійскі археолаг В.В. Сядоў. Дзякуючы яго намаганням на працягу 1950-х – пачатку 1970-х гг. была выпрацавана канцэпцыя балцкага субстрату ў этнагенезе беларусаў.

У станаўленні дадзенай канцэпцыі неабходна вылучыць два этапы. Першы этап адметны распрацоўкай і апрабацыяй палажэнняў аб тым, што падчас славянскага рассялення мясцовае даславянскае насельніцтва не пакінула рэгіёна свайго пражывання і было асімілявана каланізатарамі. Пры гэтым аўтахтоны аказалі ўплыў і на славян. У дачыненні да тэрыторыі Беларусі ўзаемаадносіны такога кшталту былі прасочаны даследчыкам паміж абарыгеннымі-балтамі і находнікамі-славянамі. Першы этап у станаўленні канцэпцыі балцкага субстрату адносіцца да першай паловы 1950-х гг. і завяршыўся абаронай кандыдацкай дысертацыі ў 1954 г. Другі этап, які працягваўся з другой паловы 1950-х да пачатку 1970-х гг., характарызуецца зваротам В.В. Сядова да больш паглыбленага вывучэння ўкладу мясцовых балтаў у культуру ўсходнеславянскіх летапісных плямёнаў. У выніку праведзенага аналізу была ўпершыню ў савецкай археалогіі пастаўлена найважнейшая навуковая праблема – этнагенез беларусаў (праблема паходжання беларускай народнасці). Вынікам вырашэння названай праблемы стала афармленне канцэпцыі балцкага субстрату ў паходжанні беларусаў. Адпаведна ёй вылучэнне беларускай народнасці ў XIII–XIV стст. з масіву старажытнарускай народнасці адбылося на падставе існавання балцкага субстрату на беларускай этнічнай тэрыторыі. Дадзеныя высновы мелі наватарскі характар, таму што ўпершыню ў савецкай гістарыяграфіі на першае месца сярод прычын адасаблення беларусаў ад старажытнарускай народнасці быў вызначаны этнічны фактар (балцкі субстрат), а не ўваходжанне беларускіх зямель у склад Вялікага Княства Літоўскага і развіццё сацыяльна-эканамічнай інтэграцыі пазначанай тэрыторыі.

Канцэпцыя балцкага субстрату ў паходжанні беларусаў аформілася ў абароненай доктарскай дысертацыі В.В. Сядова і была апрабіравана ім у апублікаванай на яе падставе манаграфіі ў 1970 г. Субстратная канцэпцыя паходжання беларусаў выклікала дыскусію ў савецкай гістарыяграфіі.

## ЛІТАРАТУРА

1. История белорусской государственности: коллектив. моногр.: в 5 т. / НАН Беларуси, Ин-т истории; редкол.: А.А. Коваленя (гл. ред.). – Минск: Бел. навука, 2018. – Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / А.А. Коваленя, В.В. Данилович, В.Ф. Голубев и др. ; отв. ред.: В.Ф. Голубев, О.Н. Левко. – 597 с.
2. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці: вучэб. дапам. / І.А. Марзалюк, А.Г. Каханоўскі, С.М. Ходзін і інш.; пад агул. рэд. І.А. Марзалюка. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с.
3. Смехович Н.В. К проблеме расселения восточных славян на территории Беларуси // Матэрыялы па археалогіі Беларусі : зб. навук. арт. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Минск, 2025. – Вып. 35. – С. 5–15.
4. Бандарчык В.К. Выбраныя працы па гістарыяграфіі паходжання і этнічнай гісторыі беларусаў: да 100-гадовага юбілею. – Минск: Бел. навука, 2020. – 427 с.
5. Зверуго Я.Г. Верхнее Понеманье в IX–XIII вв. – Минск: Навука і тэхніка, 1989. – 207 с.
6. Мядзведзеў А.М. Да пытання аб паходжанні беларусаў (па дадзеных археалогіі і мовазнаўства) // Гістарычна-археалагічны зборнік / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Минск, 1998. – № 13. – С. 10–15.
7. Сувалаў А.М. Асноўныя тэндэнцыі развіцця гістарыяграфіі этнагенезу беларусаў у навуцы канца XVIII – пачатку XXI ст. // Вестник Академии МВД Республики Беларусь. – 2016. – № 1. – С. 185–189.
8. Сувалаў А.М. Месца тэорыі «балцкага субстрату» В. В. Сядова ў гістарыяграфіі праблемы этнагенезу беларусаў 60-х – першай паловы 80-х гг. XX ст. // Вестник Академии МВД Республики Беларусь. – 2017. – № 2. – С. 192–195.
9. Сувалов О.Н. Трактовка этногенеза белорусов Н. И. Ермоловичем в контексте советской историографии конца 60-х – начала 80-х гг. XX века // Вестник Вологодского государственного университета. Серия: Исторические и филологические науки. – 2024. – № 3. – С. 26–29.
10. Штыхаў Г.В. Сядоў Валянцін Васільевіч // Археалогія Беларусі: энцыкл.: у 2 т. / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.). – Мінск, 2011. – Т. 2: Л – Я. – С. 336–337.
11. Валентин Васильевич Седов / сост. В.Е. Родинкова. – М.: Наука, 2004. – 140 с. (Материалы к биобиблиографии ученых. История ; вып. 28).
12. Седов В.В. Кривичи и словене: автореф. дис. ... канд. ист. наук. – М., 1954. – 19 с.
13. Седов В.В. О происхождении белорусов // Древности Белоруссии: Материалы конф. по археологии Белоруссии и смеж. территорий (1966 г.) / под ред. В.Ф. Исаенко, А.Г. Митрофанова, Г.В. Штыхова. – Минск, 1966. – С. 301–309.
14. Седов В.В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья (до XIV в.): автореф. дис. ... д-ра ист. наук. – М., 1966. – 39 с.
15. Седов В.В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья. – М.: Наука, 1970. – 200 с. (Материалы и исследования по археологии СССР / Акад. наук СССР, Ин-т археологии: № 163).
16. Покровский Ф.В. К исследованию курганов и городищ на восточной окраине современной Литвы // Труды Девятого археологического съезда в Вильне, 1893 : в 2 т. / под ред. гр. Уваровой, С.С. Слуцкого. – М., 1897. – Т. 2. – С. 138–196.
17. Спицын А. Предполагаемые литовские курганы VIII – IX в. // Записки Императорского русского археологического общества. Новая серия. – СПб., 1896. – Т. 8, вып. 1/2: Труды Отделения русской и славянской археологии, кн. 1. – С. 103–114.
18. Працы Першага з’езда даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі, г. Мінск, 17–18 студ. 1926 г. / Ін-т бел. культуры, Гіст.-археалаг. каміс. – Мінск: [Ін-т бел. культуры], 1926. – 86 с. – (Працы і матэрыялы да гісторыі і археалогіі Беларусі. Аддзел 2. Серыя 1; Кн. 1).
19. Лявданский А.Н. Некоторые данные о городищах Смоленской губернии (с 12 таблицами и 60 рисунками в тексте). – Смоленск: изд. Смол. гос. ун-та, 1926. – С. [5], 180–296, [13] л. табл. – Отдельный оттиск из Научных известий Смоленского государственного университета. Т. 3, вып. 3.

20. Ляўданскі А.Н. Археалагічныя даследванні ў вадазборах р. Сож, Дняпра і Касплі ў Смаленскай губерніі // Запіскі Аддзела гуманітарных навук / Бел. акад. навук. – Мінск, 1930. – Кн. 11 : Працы археалагічнай камісіі, т. 2. – С. 269–338.
21. Вяргей В.С. Археалагічная навука ў Беларускай ССР, 1919–1941 гг. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 144 с.
22. Рыбакоў Б.А. Радзімічы // Працы секцыі археалогіі / Бел. акад. навук, Ін-т гісторыі. – Мінск, 1932. – Т. 3. – С. 81–153.
23. Третьяков П.Н. Восточнославянские племена. – М.; Л.: 1-я тип. Изд-ва Акад. наук СССР в Л., 1948. – 184 с. (Научно-популярная серия).
24. Третьяков П. Н. Восточнославянские племена. – Изд. 2-е, перераб. и расшир. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1953. – 312 с. (Научно-популярная серия).
25. Центральная научная библиотека НАН Беларуси (ЦНБ НАН Беларуси). – Ф. 40. Оп. 1. Д. 11.
26. Значение трудов товарища Сталина по языкознанию для советской археологии // Вестнник древней истории. – 1951. – № 2. – С. 3–11.
27. Против вульгаризации марксизма в археологии: сб. ст. / Акад. наук СССР, Ин-т истории матер. культуры; отв. ред. А.Д. Удальцов. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1953. – 192 с.
28. Задачи советских археологов в свете трудов И.В. Сталина по вопросам языкознания и экономическим проблемам // Совет. археология. – 1953. – Вып. 17. – С. 9–22.
29. Успенская А.В. Белорусское Полесье в X – XIII вв. (к истории древне-русской деревни): автореф. дис. ... канд. ист. наук. – М., 1953. – 20 с.
30. Седов В.В. Славянские курганные черепа Верхнего Поднепровья // Советская этнография. – 1954. – № 3. – С. 12–18.
31. Митрофанов А.Г. К истории населения средней Белоруссии в эпоху раннего железа : в 2 т. : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.00. – Минск, 1955. – 401 л.
32. Алексеев Л.В. Полоцкая земля в IX–XIII вв.: автореф. дис. ... канд. ист. наук. – М., 1955. – 15 с.
33. Алексеев Л.В. Полоцкая земля (очерки истории Северной Белоруссии) в IX–XIII вв. – М.: Наука, 1966. – 295 с.
34. Моора Х.А. О древней территории расселения балтийских племен // Советская археология. – 1958. – № 2. – С. 9–33.
35. Седов В.В. Кривичи // Советская археология. – 1960. – № 1. – С. 47–62.
36. Седов В.В. Следы восточнобалтийского погребального обряда в курганах Древней Руси // Советская археология. – 1961. – № 2. – С. 103–121.
37. Седов В.В. Дреговичи // Советская археология. – 1963. – № 3. – С. 112–125.
38. Седов В.В. Еще раз о происхождении белорусов // Советская этнография. – 1969. – № 1. – С. 105–121.
39. Серебренников Б.А. О взаимодействии языков (проблема субстрата) // Вопросы языкознания. – 1955. – № 1. – С. 7–25.
40. Карский Е.Ф. Белорусы: в 3 т. – Варшава: Тип. Варшав. учеб. округа, 1903. – Т. 1: Введение в изучение языка и народной словесности: с прил. 2 к. – 466 с. – Оттиск из «Виленского временника», кн. 1.
41. Пичета В. Образование белорусского народа // Вопросы истории. – 1946. – № 5/6. – С. 3–29.
42. Гринблат М.Я. Белорусы : очерки происхождения и этнич. истории. – Минск: Наука и техника, 1968. – 285 с.
43. Алексеев В.П. Происхождение народов Восточной Европы: (краниол. исслед.). – М. : Наука, 1969. – 324 с.
44. Седов В.В. Длинные курганы кривичей. – М.: Наука, 1974. – 67 с. (Археология СССР. Свод археологических источников / Акад. наук СССР, Ин-т археологии; Вып. Е1-8).
45. Седов В.В. Происхождение и ранняя история славян. – М.: Наука, 1979. – 156 с.


*Паступіў 07.04.2026*

## СТАНОВЛЕНИЕ КОНЦЕПЦИИ БАЛТСКОГО СУБСТРАТА В ЭТНОГЕНЕЗЕ БЕЛОРУСОВ В РАБОТАХ В.В. СЕДОВА (1950 – 1970-е гг.)

***канд. ист. наук С.С. ЮРЕЦКИЙ***
***(Центральная научная библиотека имени Якуба Коласа НАН Беларуси, Минск)***

*Статья является историографическим исследованием. Публикация посвящена выявлению сущности и этапов в становлении концепции балтского субстрата в этногенезе белорусов в трудах археолога В.В. Седова в 1950 – 1970-е гг. Рассмотрены причины, которые обусловили актуализацию балтской проблематики в контексте изучения этногенеза восточных славян в советской археологии. Определены этапы в становлении данной концепции.*

***Ключевые слова:*** *историография, история археологической науки, этногенез, славяне, белорусы, балты, балтский субстрат.*

## THE FORMATION OF THE CONCEPT OF THE BALTIC SUBSTRATE IN THE ETHNOGENESIS OF THE BELARUSIANS IN THE WORKS OF V. V. SYADOV (1950s – 1970s)

***S. YURETSKI***
***(The Yakub Kolas Central Scientific Library of National Academy of Sciences of Belarus, Minsk)***

*This article is a historiographical study. It is devoted to revealing the essence and stages in the formation of the concept of the Baltic substratum in the ethnogenesis of the Belarusians in the works of the 1950s–1970s archaeologist V. V. Syadov. It considers the reasons that caused the Baltic issue to be actualised in the context of the study of the ethnogenesis of the Eastern Slavs in Soviet archaeology. The stages in the formation of this concept are identified.*

***Keywords:*** *historiography, history of archaeological science, ethnogenesis, Slavs, Belarusians, Balts, Baltic substratum.*